ISSN 1993-1972



# ГІСТОРЫЯ
## праблемы выкладання

"У дапамогу педагогу"
Серыя

НАВУКОВА-МЕТАДЫЧНЫ ЧАСОПІС 4/2009



Серыя «У дапамогу педагогу»
заснавана ў 1995 годзе

Навукова-метадычны часопіс
Выдаецца з I квартала 1997 года
Зарэгістраваны ў Міністэрстве інфармацыі Рэспублікі Беларусь
Пасведчанне № 842 ад 14.09.2007 г.
Выходзіць штомесяц са студзеня 2006 г.

# ГІСТОРЫЯ
## праблемы выкладання

"У дапамогу педагогу"
Серыя

№ 4 (82)' 2009

**РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ**

**Мікалай Іосіфавіч МІНІЦКІ** — галоўны рэдактар, *доктар гістарычных навук*

**У. В. ТУГАЙ** — першы намеснік галоўнага рэдактара, *доктар гістарычных навук, прафесар*
**Н. М. ГАНУШЧАНКА** — намеснік галоўнага рэдактара, *кандыдат гістарычных навук*
**Л. В. САЛАМАХА** — адказны сакратар
**І. І. БАГДАНОВІЧ**, *кандыдат педагагічных навук*
**С. В. ПАНОЎ**, *кандыдат педагагічных навук*
**С. М. ХОДЗІН**, *кандыдат гістарычных навук*
**В. М. ВАРАНОВІЧ**
**Л. У. ЖЭРКА**

**РЭДАКЦЫЙНАЯ РАДА**

**У. В. ТУГАЙ** — старшыня рэдакцыйнай рады
**М. М. ЗАБАЎСКІ**, *доктар гістарычных навук, прафесар*
**А. А. КАВАЛЕНЯ**, *доктар гістарычных навук, прафесар*
**В. А. КАПРАНАВА**, *доктар педагагічных навук, прафесар*
**І. В. КАРПЕНКА**
**Г. А. КОСМАЧ**, *доктар гістарычных навук, прафесар*
**У. С. КОШАЛЕЎ**, *доктар гістарычных навук, прафесар*
**М. С. СТАШКЕВІЧ**, *доктар гістарычных навук, прафесар*
**В. М. ФАМІН**, *доктар гістарычных навук, прафесар*
**І. І. ЦЫРКУН**, *доктар педагагічных навук, прафесар*
**С. М. ХОДЗІН**, *кандыдат гістарычных навук*



**Заснавальнік і выдавец —**
**РУП «Выдавецтва "Адукацыя і выхаванне"»**
**Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь**

Вул. Будзённага, 21, 220070, г. Мінск; тэл.: 297-93-20 (адк. сакратар),
297-93-22 (аддзел маркетынгу), факс: 297-91-49
e-mail: aiv@aiv.by, http://www.aiv.by

ГІСТОРЫЯ
ПРАБЛЕМЫ ВЫКЛАДАННЯ

## ЗМЕСТ ГІСТАРЫЧНАЙ АДУКАЦЫІ

3 **Сташкевич Николай**
Белорусская государственность: этапы становления (XX век)

## ІНАВАЦЫЙНЫЯ ТЭХНАЛОГІІ

7 **Добриневская Анна, Мещерякова Людмила**
Дидактический инструментарий учителя истории: логико-смысловые модели

## АРГАНІЗАЦЫЯ ВУЧЭБНАГА ПРАЦЭСУ

19 **Тугай Уладзімір, Грыгор'еў Уладзімір**
Дзяржаўнасць усходніх славян. У дапамогу настаўніку гісторыі. Гісторыя Беларусі, VI клас
26 **Болбас Валерый**
Этыка-педагагічны патэнцыял айчыннага трактата Сярэднявечча.
Матэрыялы да тэмы «Беларускія землі ў складзе Рэчы Паспалітай і 2-я палова XVI — XVIII ст.»
33 **Пілецкі Віктар**
Беларусь ва ўсходнеславянскім свеце (V — першая палова XIII стагоддзя).
Гістарычная крыніца аб рэлігійна-палітычнай сітуацыі ў Полацку
ў другой палове XI стагоддзя (XI, XI' класы)
37 **Варганаў Валерый**
Матэрыялы для настаўнікаў па тэме «Старажытныя кельты і германцы», V клас
42 **Паўлава Людміла**
Абагульняльны ўрок па раздзеле «Беларусь у XVI — першай палове XVII стагоддзя»
45 **Корзюк Александр**
Анализ урока истории с позиции формирования познавательного интереса учащихся
49 **Щербак Ирина**
Западная Европа в XVI–XVIII веках, X класс
56 **Козикова Ирина**
Реализация принципа личностного целеполагания на уроке истории
60 **Ярашэвіч Леанід**
Падрыхтоўка настаўнікаў да правядзення выніковай атэстацыі
вучняў IX класаў па гісторыі Беларусі

*Для афармлення першай і чацвёртай старонак вокладкі часопіса выкарыстаны ілюстрацыі з кнігі: Беларусь у Вялікай Айчыннай вайне: Дзень за днём (ілюстраваная храналогія) / уклад. і аўт. тэксту Я. В. Малашэвіч. – Мінск : Беларусь, 2004. – 231 с.*

© РУП «Выдавецтва "Адукацыя і выхаванне"», 2009
© Вокладка. Р. А. Раманцоў, 2009

# ПАДРЫХТОЎКА НАСТАЎНІКАЎ ДА ПРАВЯДЗЕННЯ ВЫНІКОВАЙ АТЭСТАЦЫІ ВУЧНЯЎ IX КЛАСАЎ ПА ГІСТОРЫІ БЕЛАРУСІ

*Леанід Ярашэвіч, настаўнік гісторыі вышэйшай кваліфікацыйнай катэгорыі сярэдняй школы № 15 г. Пінска*

***У 2008/09 навучальным годзе агульнаадукацыйныя ўстановы перайшлі на адзінаццацігадовы тэрмін навучання. Гэта абумовіла пэўныя змены ў структуры і змесце гістарычнай адукацыі, якія паўплывалі на вызначэнне падыходаў да правядзення абавязковай выніковай атэстацыі па гісторыі Беларусі вучняў IX і IX′ класаў. З 230 тыс. выпускнікоў базавай школы амаль палова навучаецца ў IX′ класах [1]. Прапанаваны матэрыял можа быць выкарыстаны метадыстамі, настаўнікамі-практыкамі ў якасці тэарэтычнай і практычнай дапамогі пры падрыхтоўцы да правядзення экзамену па гісторыі Беларусі.***

**Уводзіны.** Ва ўмовах пераходнага перыяду на працягу 2008/09 і 2009/10 навучальных гадоў прадугледжваецца захаванне раней існаваўшай вуснай формы выніковай атэстацыі па экзаменацыйных білетах, зацверджаных Міністэрствам адукацыі Рэспублікі Беларусь. Па сваім змесце яны ахопліваюць падзеі, з'явы і працэсы айчыннай гісторыі са старажытных часоў да сучаснасці. Пры гэтым змест гістарычнай адукацыі, які падлягае кантролю і ацэнцы ў вучняў IX і IX′ класаў, з'яўляецца для іх аднолькавым, нягледзячы на тое, што вучні штрыхавых класаў вывучаюць матэрыял навейшай гісторыі Беларусі 1917–2007 гг. на працягу аднаго года навучання ў адрозненне ад вучняў IX класаў, якія засвойвалі яго два гады. Вызначэнне гэтага зместу ажыццяўляецца зыходзячы з праграмных патрабаванняў да ведаў і ўменняў школьнікаў IX′ класа [2]. Матэрыял артыкула можна разглядаць у якасці своеасаблівага змястоўнага ядра, адзінага для вучняў IX і IX′ класаў, вакол якога знаходзіцца абалонка матэрыялу, што вывучаецца ў IX класах.

**Асноўная частка.** Пры вызначэнні найбольш аптымальнага падыходу да правядзення выніковай атэстацыі па гісторыі Беларусі на ўзроўні агульнай сярэдняй адукацыі мэтазгодна вызначыць прыкладны пералік праграмных тэм, якія выносяцца на экзамен.

1. Жыццё і заняткі першабытных людзей на тэрыторыі Беларусі.
2. Усходнеславянскія плямёны на тэрыторыі Беларусі: рассяленне, грамадскія і гаспадарчыя адносіны ў IX–XII стст.
3. Полацкае княства ў IX–XI стст. Княжацка-вечавы лад.
4. Развіццё культуры на беларускіх землях у X–XIII стст.
5. Утварэнне Вялікага княства Літоўскага. Умацаванне вялікакняжацкай улады ў першай палове XIV ст.
6. Дзяржаўны лад Вялікага княства Літоўскага ў XIV — пачатку XVI ст.
7. Знешняя палітыка Вялікага княства Літоўскага ў XIV — пачатку XV ст. Крэўская унія: прычыны, умовы і наступствы. Грунвальдская бітва.
8. Сельская гаспадарка і стан гарадоў у Вялікім княстве Літоўскім у XIV–XV стст. Запрыгоньванне сялянства.
9. Культура Беларусі ў XIV–XV стст. Паходжанне назвы «Белая Русь».
10. Люблінская унія. Становішча Вялікага княства Літоўскага ў складзе Рэчы Паспалітай.
11. Ф. Скарына — усходнеславянскі і беларускі гуманіст, асветнік, першадрукар.
12. Культура Беларусі ў XIV — першай палове XVII ст. Берасцейская царкоўная унія.
13. Усталяванне паншчыны і прыгонніцтва на беларускіх землях у XVI–XVIII стст.

«Валочная памера». Узнікненне мануфактур.

14. Культура Беларусі ў другой палове XVII–XVIII стст.

15. Далучэнне зямель Беларусі да Расійскай імперыі ў працэсе падзелаў Рэчы Паспалітай.

16. Беларусь у першай палове XIX ст.: грамадска-палітычнае і сацыяльна-эканамічнае становішча.

17. Беларусь у вайне 1812 г.

18. Разлажэнне феадальна-прыгонніцкага ладу і адмена прыгоннага права ў Беларусі.

19. Паўстанне 1863—1864 гг. у Беларусі. Погляды і дзейнасць К. Каліноўскага.

20. Развіццё капіталізму ў прамысловасці і сельскай гаспадарцы Беларусі пасля адмены прыгоннага права. Сталыпінская аграрная рэформа.

21. Культура Беларусі ў XIX ст.

22. Фарміраванне беларускай нацыі. Развіццё культуры Беларусі ў пачатку XX ст.

23. Прычыны, асноўныя падзеі і вынікі буржуазна-дэмакратычных рэвалюцый 1905–1907 гг. і Лютаўскай 1917 г. у Беларусі.

24. Беларусь у гады Першай сусветнай вайны.

25. Падзеі Кастрычніцкай рэвалюцыі 1917 г. у Беларусі. Устанаўленне ўлады Саветаў.

26. Абвяшчэнне і ўтварэнне беларускай дзяржаўнасці (1918–1920 гг.).

27. Савецкая Беларусь у гады новай эканамічнай палітыкі. Удзел БССР ва ўтварэнні СССР.

28. Індустрыялізацыя і калектывізацыя сельскай гаспадаркі ў БССР: асаблівасці, тэмпы і метады правядзення, вынікі.

29. БССР у 1920–1930-я гг.: грамадска-палітычнае жыццё. Палітыка беларусізацыі. Развіццё адукацыі і навукі, літаратуры і мастацтва.

30. Становішча Заходняй Беларусі ў 1920–1930-я гг. Уз'яднанне беларускага народа ў складзе БССР.

31. Пачатак Вялікай Айчыннай вайны. Абарончыя баі на тэрыторыі БССР. Устанаўленне нямецка-фашысцкага акупацыйнага рэжыму.

32. Барацьба беларускага народа супраць нямецка-фашысцкіх захопнікаў.

33. Вызваленне БССР ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў. Уклад беларускага народа ў Вялікую Перамогу.

34. БССР у другой палове 1940-х — першай палове 1950-х гг. Пераход да мірнага жыцця. Удзел БССР у заснаванні ААН.

35. БССР у другой палове 1950-х — першай палове 1960-х гг.: спробы дэмакратызацыі грамадска-палітычнага жыцця і сацыяльна-эканамічнае развіццё.

36. БССР у другой палове 1960-х — першай палове 1980-х гг.: грамадска-палітычнае становішча і рэфармаванне народнай гаспадаркі.

37. БССР у другой палове 1980-х гг.: асаблівасці правядзення палітыкі перабудовы і спробы паскарэння сацыяльна-эканамічнага развіцця.

38. Развіццё навукі і адукацыі, літаратуры і мастацтва ў БССР у другой палове 1940-х — 1980-я гг.

39. Утварэнне і станаўленне суверэннай Рэспублікі Беларусь. Грамадска-палітычнае жыццё ў другой палове 1990-х гг. — пачатку XXI ст.

40. Асноўныя напрамкі сацыяльна-эканамічнага развіцця Рэспублікі Беларусь у 90-я гг. XX ст. — пачатку XXI ст.

41. Рэспубліка Беларусь у сусветным супольніцтве. Фарміраванне знешнепалітычнага курсу.

42. Развіццё адукацыі, навукі і культуры ў Рэспубліцы Беларусь.

Падрыхтоўка настаўнікаў да правядзення выніковай атэстацыі вучняў IX і IX' класаў па гісторыі Беларусі можа быць прадстаўлена ў якасці *алгарытму* іх дзейнасці, які ўключае ў сябе наступныя этапы:

- структурна-функцыянальны аналіз зместу праграмнай тэмы, якая выносіцца ў якасці фармулёўкі экзаменацыйнага білета, з улікам такіх кампанентаў вучэбных гістарычных ведаў, як тэарэтычныя і фактaлагічныя, у тым ліку храналагічныя і картаграфічныя;
- вызначэнне ўзроўняў засваення вучнямі зместу праграмнай тэмы ў адпаведнасці з патрабаваннямі 10-бальнай сістэмы вучэбных дасягненняў школьнікаў [3];
- падрыхтоўка практыка-арыентаваных заданняў, выкарыстанне якіх прадугледжвае праверку дзейнаснага кампанента гістарычнай адукацыі, арыентаванага на фарміраванне ў школьнікаў агульнавучэбных і спецыяльных гістарычных уменняў.

*Змястоўны кампанент* гістарычнай адукацыі, узровень засваення якога правя-

раецца пры правядзенні выніковай атэстацыі, улічвае засваенне вучнямі асноўных ліній адукацыйнага стандарту: «гістарычны час», «гістарычная прастора», «гістарычнае развіццё», а фармулёўкі экзаменацыйных тэм — засваенне зместу пераходнай праграмы па перыядзе навейшай гісторыі Беларусі 1917–2007 гг. для IX' класаў. Пры гэтым важнае значэнне надаецца выяўленню ведаў школьнікаў сістэматызаваць, абагульняць і характарызаваць асноўныя этапы станаўлення беларускай дзяржаўнасці, асаблівасці пабудовы індустрыяльнага грамадства ў БССР, уклад беларускага народа ў перамогу над нацысцкай Германіяй у гады Вялікай Айчыннай вайны; асноўныя напрамкі развіцця суверэннай Рэспублікі Беларусь; культурна-гістарычную спадчыну і дасягненні беларускага народа. Паказчыкамі назапашаных школьнікамі ведаў па гісторыі Беларусі трэба лічыць дакладнае асэнсаванне і прымяненне факталагічных ведаў у спалучэнні з тэарэтычнымі.

Веды аб гістарычных датах, фактах, падзеях, асобах варта правяраць пераважна на I і II узроўнях распазнавання і аднаўлення зместу матэрыялу. Тэарэтычныя веды, звязаныя з паняційным мысленнем, уменнямі апісання, параўнання, рэканструкцыі, тлумачэння, магчымага раскрыцця прычынна-выніковых сувязей, характарыстыкі, выказвання ўласных адносін да падзей і іх удзельнікаў, мэтазгодна правяраць на III–V узроўнях аднаўлення зместу з улікам стварэння магчымасці іх практычнага ўжывання паводле ўзору.

*Дзейнасны кампанент* гістарычнай адукацыі арыентаваны на выяўленне ўзроўню сфарміраванасці ў школьнікаў агульнавучэбных і спецыяльных гістарычных (храналагічных, картаграфічных) спосабаў дзейнасці ў адпаведнасці з крытэрыямі ацэнкі вучэбных дасягненняў школьнікаў і 10-бальнай шкалой ацэньвання [4]. Варта ацаніць узровень сфарміраванасці ў вучняў такіх уменняў, як параўноўванне гістарычных фактаў, раскрыццё паміж імі прычынна-выніковых сувязей, суадносенне канкрэтных фактаў айчыннай і сусветнай гісторыі, тлумачэнне гістарычных паняццяў. Дзевяцікласнікі павінны навучыцца даваць характарыстыку дзейнасці гістарычных асоб і творчасці дзеячаў культуры, даказваць пэўныя тэарэтычныя высновы, працаваць з адаптаванымі гістарычнымі дакументамі, картамі (картасхемамі), іншымі крыніцамі інфармацыі, у тым ліку статыстычнымі і наглядными (ілюстрацыямі). Мэтазгодна ўлічваць магчымасць выкарыстання пры вусным разгорнутым адказе наглядных матэрыялаў, што рэгулюецца п. 77 «Правілаў правядзення атэстацыі вучняў агульнаадукацыйных устаноў» [5].

У якасці прыкладу падрыхтоўкі матэрыялаў для правядзення выніковай атэстацыі прапаноўваем метадычную распрацоўку праграмнай тэмы «Утварэнне і станаўленне суверэннай Рэспублікі Беларусь. Грамадска-палітычнае жыццё ў другой палове 1990-х гг. — пачатку XXI ст.». На I–II узроўнях распазнавання і рэпрадукцыі зместу вучэбнага матэрыялу вучань павінен:

- даваць вызначэнне наступных паняццяў: *дзяржаўны суверэнітэт; рэферэндум; унітарная, сацыяльная, прававая дзяржава; ідэалогія беларускай дзяржавы; грамадзянская супольнасць;*
- называць даты, звязаныя з прыняццем Дэкларацыі аб дзяржаўным суверэнітэце БССР (27 ліпеня 1990 г.), наданнем ёй канстытуцыйнага статуса (25 жніўня 1991 г.), зацвярджэннем новай назвы «Рэспубліка Беларусь» і дзяржаўных сімвалаў (герба і сцяга) (19 верасня 1991 г.), правядзеннем рэспубліканскіх рэферэндумаў (14 мая 1995 г., 24 лістапада 1996 г., 17 кастрычніка 2004 г.); прыняццем Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь (15 сакавіка 1994 г.), прыняццем на рэспубліканскім рэферэндуме новай рэдакцыі Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь (24 лістапада 1996 г.); правядзеннем прэзідэнцкіх выбараў у Рэспубліцы Беларусь (1994 г., 2001 г., 2006 г.);
- пералічваць прозвішчы першага Героя Беларусі і кіраўніка Беларускай праваслаўнай царквы, найбольш значныя дзяржаўныя ўзнагароды Рэспублікі Беларусь, вышэйшыя прадстаўнічы і заканадаўчы, выканаўчы, судовы органы ўлады Рэспублікі Беларусь, галоўныя пытанні, вынесеныя на рэспубліканскія рэферэндумы 1995 г., 1996 г., 2004 г., назвы асноўных канфесій, якія існуюць у Рэспубліцы Беларусь.

На III узроўні асэнсаванага аднаўлення зместу вучэбнага матэрыялу вучні дэманструюць уменні:

- паслядоўна апісваць працэс афарм-

лення дзяржаўнага суверэнітэту Рэспублікі Беларусь;

- тлумачыць назву «Белавежскае пагадненне»; прынцып падзелу ўлад;
- элементы сучаснай дзяржаўнай сімволікі Рэспублікі Беларусь;
- называць характэрныя рысы дзяржаўнага суверэнітэту, прыкметы прававой дзяржавы; прававую, эканамічную, светапоглядную асновы ідэалогіі беларускай дзяржавы, найбольш значныя напрамкі, да якіх адносяцца палітычныя партыі ў Рэспубліцы Беларусь.

На IV узроўні алгарытмізаванай дзейнасці вучні:

- характарызуюць Рэспубліку Беларусь як унітарную, сацыяльную, прававую дзяржаву; асновы ідэалогіі Рэспублікі Беларусь; адносіны паміж дзяржавай і рэлігійнымі арганізацыямі;
- самастойна параўноўваюць форму дзяржаўнага кіравання ў Рэспубліцы Беларусь да і пасля правядзення рэспубліканскага рэферэндуму 24 лістапада 1996 г.;
- раскрываюць прычынна-выніковыя сувязі паміж прыпыненнем існавання СССР, стварэннем СНД, абвяшчэннем дзяржаўнага суверэнітэту нашай рэспублікі.

На V узроўні творчай дзейнасці вучні:

- ацэньваюць гістарычнае значэнне абвяшчэння суверэнітэту Рэспублікі Беларусь;
- параўноўваюць розныя пункты гледжання па пытанні аб прыпыненні існавання СССР;
- абгрунтавана выказваюць свае адносіны да прыпынення існавання СССР і стварэння СНД; працэсу фарміравання прававой дзяржавы і грамадзянскай супольнасці ў Рэспубліцы Беларусь.

Для адпрацоўкі вучнямі IX і IX′ класаў спосабаў дзейнасці і іх замацавання прапануецца сістэма практыка-арыентаваных заданняў, некаторыя з якіх маюць прыкладны характар.

1. Напішыце ў правым слупку табліцы, як увасобіліся ў жыццё рашэнні, прынятыя на рэспубліканскім рэферэндуме 14 мая 1995 г.

| Пытанні рэферэндуму | Рэалізацыя рашэнняў рэферэндуму |
|---|---|
| Ці згодны вы з наданнем рускай мове роўнага статуса з беларускай? | |
| Ці падтрымліваеце вы прапанову аб устанаўленні новых Дзяржаўнага сцяга і Дзяржаўнага герба Рэспублікі Беларусь? | |
| Ці падтрымліваеце вы дзеянні Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь, накіраваныя на эканамічную інтэграцыю з Расійскай Федэрацыяй? | |

2. Растлумачце, што абазначае канстытуцыйнае вызначэнне Рэспублікі Беларусь як унітарнай дэмакратычнай сацыяльнай прававой дзяржавы.

3. Раскрыйце прычынна-выніковую сувязь паміж распадам СССР і стварэннем СНД.

4. Растлумачце, якія палажэнні ў Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь з'яўляюцца прававой асновай ідэалогіі беларускай дзяржавы.

5. Запішыце, у чым заключаецца прыкметы дзяржаўнага суверэнітэту. Выкарыстайце вытрымку з Дэкларацыі аб дзяржаўным суверэнітэце БССР ад 27 ліпеня 1990 г.:

«Вярхоўны Савет Беларускай Савецкай Сацыялістычнай Рэспублікі... урачыста абвяшчае поўны дзяржаўны суверэнітэт Беларускай ССР як вяршэнства, самастойнасць і паўнату дзяржаўнай улады рэспублікі ў межах яе тэрыторыі, правамоцнасць яе законаў, незалежнасць рэспублікі ў знешніх зносінах і заяўляе аб рашучасці стварыць прававую дзяржаву.

Артыкул 1. Беларуская Савецкая Сацыялістычная Рэспубліка — суверэнная дзяржава, якая ўсталявана на аснове ажыццяўлення беларускай нацыяй яе неад'емнага права на самавызначэнне, дзяржаўнасці беларускай мовы, вяршэнства народа ў вызначэнні свайго лёсу...

Артыкул 2. Грамадзяне Беларускай ССР усіх нацыянальнасцей складаюць беларускі народ, які з'яўляецца носьбітам суверэнітэту і адзінай крыніцай дзяржаўнай улады ў рэспубліцы».

6. Растлумачце, што абазначае канстытуцыйнае палажэнне аб тым, што адзінай

крыніцай дзяржаўнай улады і носьбітам суверэнітэту ў Рэспубліцы Беларусь з'яўляецца народ.

7. Раскрыйце прычынна-выніковую сувязь паміж вынікамі рэспубліканскага рэферэндуму 24 лістапада 1996 г. і зменамі ў Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь. Выкарыстайце вытрымку з Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь 1994 г. (са змяненнямі і дапаўненнямі), прынятай на рэспубліканскім рэферэндуме 24 лістапада 1996 г.

«Артыкул 6. Дзяржаўная ўлада ў Рэспубліцы Беларусь ажыццяўляецца на аснове падзелу яе на заканадаўчую, выканаўчую і судовую.

Артыкул 79. Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь з'яўляецца кіраўніком дзяржавы, гарантам Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь, правоў і свабод чалавека і грамадзяніна.

Артыкул 90. Парламент — Нацыянальны сход Рэспублікі Беларусь — з'яўляецца прадстаўнічым і заканадаўчым органам Рэспублікі Беларусь. Парламент складаецца з дзвюх палат — Палаты прадстаўнікоў і Савета Рэспублікі.

Артыкул 106. Выканаўчую ўладу ў Рэспубліцы Беларусь ажыццяўляе ўрад — Савет міністраў Рэспублікі Беларусь — цэнтральны орган дзяржаўнага кіравання».

8. Чаму на рэферэндуме 24 лістапада 1996 г. пераважная большасць насельніцтва Беларусі выказалася за перанясенне Дня Незалежнасці (Дня Рэспублікі) з 27 ліпеня на 3 ліпеня?

9. Вызначце, у чым заключаецца шматвяковая гісторыя развіцця беларускай дзяржаўнасці, на якую абапіраўся народ Беларусі, калі прымаў Асноўны Закон Рэспублікі Беларусь.

10. Растлумачце, у чым заключаецца беларуская нацыянальная ідэя як светапоглядная аснова ідэалогіі беларускай дзяржавы.

**Высновы.** Такім чынам, падрыхтоўка настаўнікаў да правядзення выніковай атэстацыі вучняў IX і IX′ класаў па гісторыі Беларусі прадугледжвае ажыццяўленне алгарытму, звязанага са структурна-функцыянальным аналізам зместу вучэбнага праграмнага матэрыялу, які выносіцца на экзамен з улікам тэарэтычнага і фактычнага кампанентаў вучэбных гістарычных ведаў; вызначэнне ўзроўняў засваення вучнямі зместу гістарычнага матэрыялу, сфарміраванасці агульнавучэбных і спецыяльных гістарычных спосабаў вучэбнай дзейнасці ў адпаведнасці з патрабаваннямі 10-бальнай сістэмы вучэбных дасягненняў школьнікаў; падрыхтоўку комплексу практыка-арыентаваных заданняў, якія прадугледжваюць трэнінгавую працу вучняў [6].

## Спіс выкарыстанай літаратуры


1. Аналіз зместу навучання працягваецца // Настаўн. газ. — 2008. — 16 кастр. — С. 1.
2. Всемирная история. История Беларуси. V–XI классы : учеб. программы для общеобразовательных учреждений с белорус. и рус. языками обучения. — Минск : НИО, 2008. — 128 с.
3. Десятибалльная система оценки результатов учебной деятельности учащихся : инструктивно-методические материалы / под ред. О. Е. Лисейчикова. — Минск : НИО, 2002. — 96 с.
4. Критерии и показатели качества обучения в учреждениях, обеспечивающих получение общего среднего образования // Настаўн. газ. — 2003. — 11 вер. — С. 2.
5. Правілы правядзення атэстацыі вучняў агульнаадукацыйных устаноў // Настаўн. газ. — 2007. — 15 сак. — С. 3.
6. *Паноў, С. В.* Гісторыя Беларусі: 10 кл. : практычныя заданні для падрыхтоўкі да экзамену за курс базавай школы / С. В. Паноў. — Мінск : Аверсэв, 2008. — 216 с.



Рэдактар Л. В. Саламаха, карэктар Г. В. Міронава.
Камп'ютэрны набор А. І. Рамановіч, вёрстка Дз. Л. Слаута.

Падпісана ў друк з гатовых дыяпазітываў 09.04.2009. Выхад у свет 22.04.2009.
Фармат 60×84 1/8. Друк афсетны. Папера афсетная. Ум. друк. арк. 7,44. Ул.-выд. арк. 7,5.
Тыраж 1455 экз. Заказ № 42. Цана свабодная.

Адрас рэдакцыі часопіса «Гісторыя: праблемы выкладання»:
вул. Будзённага, 21, 220070, г. Мінск; тэл. 297-93-20.

Надрукавана ў друкарні
РУП «Выдавецтва “Адукацыя і выхаванне”».
ЛП № 02330/0150009 ад 12.03.2007.
Вул. Захарава, 59, 220088, г. Мінск.